Великой Отечественной войне / Т.В. Демидович // Вестник Челябинского гос. уи-та: Филология. Искусствоведение. – 2013. – №10. – С. 38–40.

**УДК 94(476)**

## АБ ЧЫМ РАСКАЗВАЮЦЬ СЛУЦКІЯ ПАЯСЫ…

*Студэнты – Балыкоў У.С., 45 тс, 1 курс, ФТС;*
*Пацаў К.В., 45 тс, 1 курс, ФТС*
*Навуковы*
*кіраўнік – Платоненка А.В., ст. выкладчык*
*УО «Беларускі дзяржаўны аграрны тэхнічны ўніверсітэт», г. Мінск, Рэспубліка Беларусь*

**Анатацыя.** У дадзеным артыкуле расказваецца пра цікавыя факты з гіторыі слуцкіх паясоў.

**Ключавыя словы:** сувенір, беларускія ткачы, арнамент, слуцкі пояс, аксесуар, узоры.

Славутыя слуцкія паясы – цудоўны ўзор дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва, які стаў не толькі гістарычным культурным сімвалам, але і сучасным брэндам Беларусі.

Надзвычай прыгожы, сімвалічны і дарагі прадмет мужчынскага гардэроба, даступны толькі выхадцам з вышэйшых саслоўяў – слуцкія паясы – ткалі ў Беларусі яшчэ ў XVIII стагоддзі. З імі звязаны дзіўныя падзеі і сямейныя таямніцы, загадкавыя і часам містычныя гісторыі.

Сёння старадаўнія слуцкія паясы – рарытэт: у Беларусі захоўваюцца адзінкавыя экзэмпляры і фрагменты, а большая частка твораў нацыянальнага дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва знаходзіцца ў музейных і прыватных калекцыях свету.

Доўгія шырокія паясы з прыгожым малюнкам і складаным пляценнем з каштоўных нітак атрымалі распаўсюджанне на беларускіх землях яшчэ ў XVI–XVII стагоддзях. Гэтаму садзейнічалі паданні аб паходжанні арыстакратыі Рэчы паспалітай ад старажытных ваяўнічых плямёнаў сарматаў.

У адзенні магнатаў пояс быў сімвалам прыналежнасці да эліты, шматвяковых сямейных традыцый і, вядома, заможнасці. Дарагія паясы для шляхты прывозілі з усходніх краін, але ў XVIII стагоддзі на беларускіх землях сфарміравалася ўнікальная мастацкая з’ява – "слуцкі пояс".

Беларускія ткачы стварылі свае непаўторныя ўзоры і сімвалічныя матывы, эксклюзіўную тэхналогію. Сусветную вядомасць атрымалі паясы Слуцкай персіярні – мануфактуры самай заможнай і ўплывовай дынастыі Еўропы Радзівілаў.

Першая персіярня ўзнікла ў Нясвіжы, але па распараджэнні Міхаіла Казіміра Радзівіла Рыбанькі ў 1750-я гады яе перанеслі ў Слуцк, які здаўна славіўся ўмелымі ткачамі.

Для кіравання быў запрошаны вядомы майстар Ян Маджарскі (Аванес Маджаранц армянскага паходжання, які працаваў у Стамбуле, Станіславе). У 1777–1807 гадах мануфактурай кіраваў яго сын Лявон.

У час росквіту ў Слуцку працавалі да 55 ткачоў (толькі мужчыны!), столькі ж чаляднікаў і прадзільшчыц. На 20–25 станках штогод выпускалі каля 200 паясоў вельмі тонкай работы.

У хуткім часе слуцкія паясы пачалі капіраваць на іншых мануфактурах: у беларускіх Гродне, Слоніме, Ружанах, Паставах, Карэлічах, Шклове, польскіх Кабылках, Ліпкаве, Кракаве, Гданьску, французскім Ліёне, у Аўстрыі…

Але нават нягледзячы на знак "Мяне зрабіў Слуцк", гэта не былі сапраўдныя слуцкія паясы. Вытворчасць арыгіналаў на самой мануфактуры Радзівілаў прадаўжалася да сярэдзіны XIX стагоддзя.

Лічаць, што сёння ў свеце захавалася каля тысячы слуцкіх паясоў. І амаль усе яны знаходзяцца за межамі Беларусі: у музейных зборах Польшчы (Варшава, Кракаў, Познань, Гданьск), Украіны (Кіеў, Львоў), Расіі (Масква, Санкт-Пецярбург), Літвы (Вільнюс, Каўнас), у прыватных калекцыях.

Беларускія музеі захоўваюць 11 слуцкіх паясоў розных гадоў вырабу і рознага стану, а таксама шматлікія фрагменты.

Класічны слуцкі пояс – гэта раскошная доўгая (до 3,5–4 м) тканіна шырынёй 35–40 см, якую, складваючы ўдвая або скручваючы, павязвалі паверх шляхецкага адзення (кунтуша). Шыкоўны аксесуар мог быць адна-, двух-, трох-, чатырохбаковым. Кожны з бакоў выкарыстоўваўся ў залежнасці ад каларыту адзення і сітуацыі. Напрыклад, на свята пояс павязвалі наверх залатой, чырвонай часткай; у жалобу выкарыстоўваўся чорны бок; у паўсядзённым жыцці – зялёны і шэры.

Па кампазіцыі слуцкі пояс падзелены на тры часткі: два прамавугольныя канцы і асноўная частка ("сярэднік").

На "канцах" ткалі ўзоры кветак, пераплеценых сцяблін з лістамі, галінак дрэва, медальёны разнастайнай формы. Асноўная частка складалася з папярочных аднатонных палос або палос з арнаментам. Часам тут з'яўляўся "лускавы" (падобны на рыбіну луску) малюнак або ўзор "у гарошак". Уздоўж бакоў пояса – вузкі бардзюр з раслінным арнаментам. Канцы таксама завяршае паласа з арнаментам і махры.

Слуцкі пояс ткалі з натуральных шаўковых нітак: звычайных і абкручаных вельмі тонкім залатым або сярэбраным дротам. Такі

каштоўны аксесуар называўся "літым", бо пасля пракатвання крыху шурпатага пояса цераз спецыяльны вал з’яўляліся незвычайная гладкасць і раскошны бляск.

Сапраўдны слуцкі пояс мог змяшчаць да 200 грамаў золата: за адзін такі дарагі аксесуар у даўнія часы можна было купіць некалькі пародзістых коней або нават невялікі маёнтак.

На кожным поясе слуцкія майстры ставілі асаблівыя меткі: у час Рэчы Паспалітай – на лацініцы, пазней на кірыліцы: "SLUCK", "SLUCIAE", "SLUCIAE FECIT", "MEFECIT SLUCIAE" ("Мяне зрабіў Слуцк"), "ВЪ ГРАДЪ СЛУЦКЪ"…

Славуты верш "Слуцкія ткачыхі" Максіма Багдановіча расказвае пра прыгонных дзяўчын, якія замест персідскага ўзору ткалі "цвяток радзімы васілька". Аднак лірычная гісторыя – мастацкая выдумка, паколькі ткаць паясы мелі права толькі мужчыны – умелыя майстры, праца якіх добра аплачвалася.

Вывучыўшы сакрэты ткачоў, мастацкія асаблівасці паясоў і матэрыялы, з якіх яны вырабляліся ў XVIII стагоддзі, у Слуцку аднавілі вытворчасць копій, аналагаў слуцкіх паясоў. Пры стварэнні копій сучасныя слуцкія ткачы выкарыстоўваюць натуральны шоўк, ніткі з золатам і серабром у саставе, нітку "ізамет" і поліэстэр металік. Аналагаў гэтым вырабам у свеце няма.

1. http://gw.lingvo.minsk.by/mab/@book/BOOKS/Albaruthenica/AB_21/_21.htm

**УДК 811.163.3**

## КАЛАРОНІМЫ Ў ФРАЗЕАЛАГІЧНЫМ КАНТЭКСЦЕ

*Студэнты – Орцюх П.І., 45 тс, 1 курс, ФТС;*
*Фурса А.Ю., 45 тс, 1 курс, ФТС*
*Навуковы*
*кіраўнік – Платоненка А.В., ст. выкладчык*
*УО «Беларускі дзяржаўны аграрны тэхнічны ўніверсітэт», г. Мінск, Рэспубліка Беларусь*

**Анатацыя**. У дадзеным артыкуле расказваецца пра семантычны і выяўленчы патэнцыял колеравай лексікі.

**Ключавыя словы:** каларонімы, белы, чырвоны, чорны, семантыка, фразеалагізм.

Праблема колераабазначэння ў лінгвістыцы стала ў апошнія дзесяцігоддзі дастаткова актуальнай. Замежныя і айчынныя моваведы актыўна вывучаюць камунікатыўны, семантычны, сінтагматычны і